най маст. дэталі. Можа ўзнікаць пры ўжыванні імя аўтара ў значэнні напісаных ім твораў («вывучаю Пушкіна», «купіў Багдановіча»), назвы мясцовасці — у значэнні насельніцтва, якое там жыве («І Памір, і лясы Белавежы // За радзіму ўставалі сваю». П.Броўка, «Думы пра Маскву»), назвы прылады дзеяння замест яго самога ці яго вынікаў («вострае пяро Крапівы»), назвы посуду замест таго, што ў ім звычайна знаходзіцца («выпіў кубак», «з'еў талерку»), перанос значэння ўнутранай уласцівасці рэчы на яе самую («смеласць гарады бярэ»). Многія творы Я.Купалы («А хто там ідзе?», «Перад вісельняй»), Я.Коласа («Ворагам», «Ліпы старыя»), Цёткі («Хрэст на свабоду», «Добрыя весці»), М.Багдановіча («Слуцкія ткачыхі», «Народ, Беларускі народ», «Пагоня») пабудаваны на скразных метанімічных вобразах, якія ўвасаблялі найб. вострыя грамадскія канфлікты эпохі. У бел. сав. л-ры М. шырока выкарыстоўвалі ў сваіх творах У.Дубоўка («О Беларусь, мая шыпшына»), М.Чарот («Босыя на вогнішчы»), П.Броўка («Александрына»), А.Куляшоў («Над брацкай магілай», «Маё пасведчанне»), М.Танк («Раманс», «Ave Maria»), П.Панчанка («Дарогай вайны», «Залаты рубель») і інш. У наш час М. шырока выкарыстоўваецца ў творах маст. л-ры і публіцыстыцы. Адзін з відаў М. — *сінекдаха.*

**МЕТАТЭ́ЗА** (ад грэч. metathesis перастаноўка), перастаноўка гукаў ці складоў у слове з мэтай змяніць агульнапрынятае гучанне і тым самым надаць яму новыя сэнсавыя адценні. Найчасцей узнікае пры запазычанні слоў з інш. моў і ў дзіцячым маўленні. Нярэдка М. ўзнікаюць у дыялектнай мове («жорнавы—жорваны»). Часам выкарыстоўваюцца для стварэння камічнага эфекту ў творы л-ры. Адзначаюцца выпадкі пранікнення М. ў літ. мову і замацавання яе ў якасці нормы. Напр., бел. «талерка» (лац. taliare), «мармур» (лац. marmor), «далонь» (стараслав. длань ) і рус. «тарелка», «мрамор», «ладонь» і г.д.

*Літ.:* Р а г о й ш а В. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах. Мінск, 2001; З а б а ш т а н с к а я А. Метатэза ў дыялектнай беларускай мове // Роднае слова. 2005. № 12.

**МЕТА́ФАРА** (ад грэч. metaphora перанос, пераноснае значэнне), слова ці выраз, якія выкарыстоўваюцца ў пераносным значэнні пры параўнанні пэўнага прадмета з інш. прадметам на аснове іх падабенства; адзін з відаў *тропа.* У М. вылучаецца толькі нейкая адзіная рыса прадмета, з'явы, стану, якая і выклікае яе ў нашым уяўленні. М. можа стварацца на падабенстве формы: «званочак» (памяншальнае ад званок) і «званочак» (кветка); колеру: «залаты пярсцёнак» і «залаты ліст»; функцыі: «крыло птушкі» і «крыло самалёта» і інш. Часам пераносяцца назвы з прадметаў, з'яў, уласцівых чалавеку, на прадметы, з'явы нежывой прыроды і наадварот: «глухі чалавек» і «глухі куток», «лагодны хлопчык» і «лагодны ветрык», «спіць дзіця» і «спіць рака», «цёплая вада» і «цёплая сустрэча». Прырода стварэння М. пры дапамозе вобразнага паралелізму часам раскрываецца ў многіх творах нар. лірыкі: Віў ён вяроўкі з маіх русых кос, // Часаў ён ачоскі з маіх белых плеч, // І пускаў ён рэчкі з маіх дробных слёз. М. заўсёды перадае тую ці інш. асаблівасць вобраза прадметна, таму ў яе маст. успрыманні ўзнікаюць канкрэтныя асаблівасці навакольнага свету, дынаміка рухаў і адчуванняў персанажа, што дазваляе выявіць сувязь паміж жыццём і мастацтвам. Сутнасць М. заключаецца ў такой падмене аднаго паняцця другім, пры якім вылучаецца агульная прыкмета для абодвух паняццяў. Гэта азначае, што вобразнае метафарычнае ўспрыняцце ўзнікае толькі ў тым выпадку, калі будзе заўважацца нешта спецыфічнае, што зближае прадмет ці з'яву з імі падобнымі. М. раскрывае ў розных фалькл. жанрах не толькі эстэтычнае багацце і хараство рэчаіснасці, але і дзеянні, учынкі і пачуцці людзей у пэўных жыццёвых абставінах. Напр., у казках дзеянні персанажаў набываюць незвычайную паэт.-маст. вобразнасць: «Стаіць будовіна пад самае неба, над будынкам вясёлка іграець, мост агнём гарыць». М. ўзбагачае маст. палітру жыццёвых сітуацый, якая ўздзейнічае на ўспрыняцце чалавека і выклікае разнастайныя вобразы-асацыяцыі, эмоцыі — ад жартоўна-сатыр. да ўласных глыбокіх перажыванняў.

*Літ.:* Г і л е в і ч Н.С. Паэтыка беларускай народнай лірыкі. Мінск, 1975; Я н к о ў с к і М.А. Паэтыка беларускай народнай прозы. Мінск, 1983.

*А.М.Аляхновіч.*

**МЕТАФІ́ЗІКА** (ад грэч. meta ta phisica тое, што пасля фізікі), 1) раздзел *філасофіі,* прысвечаны гал. абстрактным праблемам чалавечага быцця і пазнання. Паняцце ўведзена ў навук. ўжытак у 1-м ст. да н.э. александрыйскім бібліятэкарам Андронікам Радоскім, які сістэматызаваў працы Арыстоцеля і аб'яднаў пад гэтай назвай тыя работы, што выходзілі за межы прыродазнаўча-навук. твораў («фізікі»). У гіст.-філас. даследаваннях тэрмін М. нярэдка выкарыстоўваецца як сінонім слова «філасофія». 2) Раздзел філасофіі, які даследуе пытанні анталогіі (ад грэч. ontos існае і logos вучэнне) і надпачуццёвыя прынцыпы быцця. У эпоху Сярэдневякоўя мела пануючую ролю ў філас. думцы, разглядалася як вышэйшая форма рацыянальнага пазнання быцця, была арганічна звязаная з тэалогіяй, што прывяло да ператварэння М. ў *схаластыку.* 3) Процілеглы *дыялектыцы* спосаб мыслення, згодна з якім свет і навакольныя прадметы разглядаюцца безадносна да крыніцы іх самаразвіцця, нярэдка як застылыя і нерухомыя.

*Т.І Адула.*

**МЕТО́П** (грэч. metopon літаральна прастора паміж вачыма), м е т о п а, прамавугольная або квадратная пліта паміж двума *трыгліфамі* ў фрызе *дарычнага ордара.* З'явілася ў архітэктуры Стараж. Грэцыі (спачатку М. на-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ